**Літвіновіч А.Ф. (Мінск)**

# Максім Багдановіч аб некаторых фактах і з’явах беларускай гісторыі і культуры

М. Багдановіч быў не толькі таленавітым паэтам, але і добрым знаўцам беларускай гісторыі і культуры. І хаця ён не мае спецыяльных гістарычных прац, у шэрагу артыкулаў, прысвечаных культуры і літаратуры беларусаў, закранае гісторыю свайго народа. Яго працы, напрыклад, «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця», «За сто гадоў», «Сталецце руху беларускага народа», «Белорусское возрождение», «Беларусы», «Хто мы такія?» і інш., даюць яркае ўяўленне аб М. Багдановічу як даследчыку мінулага.

Паспрабуем даць ацэнку некаторым яго працам у галіне гістарычнага і культурнага мінулага Беларусі. Так, «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця» складаецца з 5-ці параграфаў. У першым М. Багдановіч падкрэслівае, што беларуская народнасць фарміравалася на аснове плямён крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў і дулебаў. Сучасныя даследчыкі (у прыватнасці, В.В. Сядоў) пад дулебамі разумеюць, па-першае, племянную групу, у якую ўваходзілі ў апошняй чвэрці I тыс. н.э. паляне, драўляне і валыняне, дрыгавічы [7, с. 93]. Па-другое, у IX – пачатку XI ст. пад найменнем «дулебы», паводле археалагічных, гідра- і тапанімічных дадзеных, маглі выступаць дрыгавічы, якія межавалі ў той час з крывічамі. На мяжы гэтых двух плямён (дулебаў-дрыгавічоў і крывічоў) сустракаюцца гідронімы Дулеба і Дулебка ў басейне ніжняй Свіслачы, в. Дулебна ў Бабруйскім павеце і в. Дулебы ў Чэрвеньскім павеце [7, с. 93].

У трэцім параграфе М. Багдановіч разглядае «Слова пра паход Ігаравы», які лічыць, услед за І. Франко, М. Грушэўскім, Я. Ляцкім, кампіляцыяй паасобных тэкстаў, складзеных у розны час і ў розных месцах. Сярод «рознакалёрных, незалежных адзін ад аднаго кавалкаў» твора ён вылучае два фрагменты, якія, па яго меркаванні, маюць беларускае паходжанне. Гэта фрагмент, вольны пераклад якога на беларускую мову М. Багдановіч надрукаваў у 1911 г. пад найменнем «Песня пра князя Ізяслава Полацкага», і «песня-казка» пра Усяслава Полацкага.

М. Багдановіч адзін з першых сярод беларускіх культурных дзеячаў канца XIX – пачатку XX ст. усвядоміў, што ВКЛ з’яўлялася ў аснове сваёй беларускай дзяржавай. Праўда, ён не называе прычын гэтага. Сучасныя гісторыкі ўказваюць на галоўныя фактары, якія прывялі да ўтварэння ВКЛ. Яго ўзнікненне было вынікам, як піша М. Ермаловіч, эканамічнага, палітычнага і культурнага збліжэння беларускіх зямель, якое пачалося ў канцы XII – пачатку XIII ст. Гэтаму не супярэчыць назва дзяржавы, бо ў XII–XIII стст. пад Літвой мелася на ўвазе не сучасная Літва, а тэрыторыя Беларускага Панямоння, што і растлумачвае, чаму першай сталіцай гаспадарства стаў Навагрудак [3, с. 29–39]. На самой справе, у цэнтральнай і заходняй частках Беларусі маецца шмат этнатапонімаў «Літва», «Літоўшчына», «Ліцвінка», «Літоўскі лес» і інш. Пра гэта сведчаць і некаторыя этнаграфічныя, фальклорныя і моўныя дадзеныя. У заходняй і цэнтральнай частках Беларусі, напрыклад, прылада для ўзорвання глебы называлася літоўскай сахой, а прылада для яе рыхлення – літоўскай бараной (Барысаўскі павет). З даўніх часоў і аж па XVIII ст. на тэрыторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гарадзенскай і Мінскай губерняў існавала асаблівая парода коней, якая называлася «літоўскі конь». На Наваградчыне выраблялі сыр, які меў назву «літоўскі» [5, с. 236–237]. У апошні час беларускія гісторыкі звяртаюць увагу на тое, што дзяржава Міндоўга ўтварылася ў асноўным на славянскай тэрыторыі з гарадамі Навагрудак, Слонім, Ваўкавыск, Гародня і інш. [8, с. 16].

У артыкуле «Белорусское возрождение» на аснове даследаванняў Я. Карскага і іншых беларускіх вучоных М. Багдановіч прыйшоў да высновы, што беларуская народнасць у аснове сваёй сфарміравалася ў канцы XIII ст. [3, с. 471]. Адзначаючы высокае развіццё беларускай культуры і мовы ў XVI ст., М. Багдановіч далей сцвярджае, што ў XVII–XVIII стст. яна перажывае заняпад. Гэта – з аднаго боку. З другога боку, «этот язык, переставший уже служить основою для культурного строительства в Литовской Руси, всё ещё повсеместно господствовал в домашнем обиходе многих слоёв населения, даже тяготевших к Польше. Этим и объясняется широкое развитие рукописной белорусской литературы, идущее сплошь на протяжении XVII, XVIII и отчасти XIX столетий» [2, с. 263]. Так, беларуская народная моўная стыхія панавала на нашай этнічнай тэрыторыі (у вёсках, мястэчках) не толькі ў XIII–XVII стст., але і пазней – у XVIII–XX стст., што пацвярджаецца фактамі. Многія пісьменнікі, мастакі, музыканты і іншыя культурныя дзеячы былі выхадцамі не толькі з вёсак, але і з мястэчак, з невялікіх гарадоў. Акрамя таго, мясцовыя татары выкарыстоўвалі беларускую мову пры напісанні кніг для набажэнства не толькі ў XV–XVII стст., але ў пэўных рэгіёнах Беларусі і ў канцы XVIII ст.

У XIV–XVII стст. мова беларускага народа была афіцыйнай у Вялікім Княстве Літоўскім: як на землях Беларусі, так і Літвы (XIV–XVII стст.), а таксама на тэрыторыі Украіны (з 60-х гг. XIV ст. па XVI ст.). Украінскія тэрыторыі (Северская, Чарнігаўская, Пераяслаўская, Кіеўская, Падольская, Валынская землі) былі заваяваны Альгердам і вызвалены ад татар [1, с. 107]. Варта падкрэсліць, што ў Падоллі Альгерд прызначыў сваімі намеснікамі наваградскіх князёў Карыятавічаў (Аляксандра, Канстанціна, Юрыя, Фёдара) у сувязі з найбольшым удзелам іх у разгроме татарскіх войск.

Шэраг сучасных беларускіх даследчыкаў, падобна М. Багдановічу, лічыць ВКЛ беларускай або беларуска-балцкай дзяржавай. І. Пірожнік піша: «У Вялікім Княстве Літоўскім <...> фактычна склалася беларуская дзяржаўнасць – з беларускай мовай і пісьменствам, культурай, законамі і ўдзелам беларускага саслоўя шляхты ў дзяржаўных справах» [6, с. 57]. Высокі статус беларускай мовы пацвярджае І. Первольф, адзначаючы, што беларуская і чэшская мовы ў XIV – XVII стст. былі найбольш прэстыжнымі ў славянскім свеце.

Такім чынам, М. Багдановіч з'яўляўся сталым даследчыкам беларускай гістарычнай і культурнай мінуўшчыны. Ён імкнуўся нашай гісторыі і культуры даць аб'ектыўную ацэнку. Большасць высноў М. Багдановіча пацвярджаюцца сучаснымі даследаваннямі вучоных.

**Літаратура**

1. Акимович, Е.О. Українська культура в історичному вимірі (IX–XVII століття) / Е.О. Акимович. – Одесса, 2009.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Ермаловіч, М. Выбранае / М. Ермаловіч. – Мінск, 2010.
4. Максім Багдановіч : энцыклапедыя ; склад. І.У. Саламевіч, М.В. Трус ; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011.
5. Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада) : матэрыялы Міжнар. нав. канф., Мінск, 7–9 верас. 2007 г. ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2008.
6. Пирожник, И.И. Геополитика в современном мире : учеб. пособ. / И.И. Пирожник. – Минск, 2008.
7. Седов, В.В. Восточные славяне в VI–XIII вв. / В.В. Седов. – М., 1982.
8. Панов, С.В. История Беларуси. 6–11 классы: основные даты и события с комментариями / С.В. Панов. – Минск, 2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ